УДК 655.2:81'35

М. У. Макарчук, студэнтка
У. І. Куліковіч, дацэнт, канд. філал. навук
(БДТУ, г. Мінск)

# ВІДЫ ВУЧЭБНЫХ ВЫДАННЯЎ АРФАГРАФІЧНАЙ ТЭМАТЫКІ Ў 60-Я ГАДЫ XX СТ.

**Уводзіны**. З канца 50-х гг. у Беларусі прымаліся актыўныя меры па выпрацоўцы новых падыходаў да развіцця адукацыі. Вынікі такіх намаганняў для сістэмы беларускага навучання неадназначныя. З аднаго боку назіралася станоўчая тэндэнцыя ахапіць адукацыйнымі паслугамі ўсіх дзяцей і падлеткаў (увядзенне з 1959 г. абавязковага 8-гадовага навучання), з другога – русіфікацыя адукацыйнага працэсу, падчас арганізацыі якога слаба ўлічваліся нацыянальныя асаблівасці, бо не было ніводнай сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай навучальнай установы з беларускай мовай навучання [1]. Усё гэта, а таксама з'яўленне ў 1959 г. зборніка «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» [2; 3], прадвызначылі перагляд вучэбных выданняў па беларускай мове для розных катэгорый навучэнцаў.

Задача артыкула – устанавіць чытацкі адрас і віды вучэбных выданняў, створаных у 60-я гг XX ст., дзе адлюстравана арфаграфічная праблематыка. Матэрыялам для даследавання паслужылі вучэбныя кнігі, аўтарэфераты дысертацый, прысвечаныя пытанням беларускага правапісу. Сярод іх падручнікі для вучняў, дапаможнікі для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей і педінстытутаў, арфаграфічныя слоўнікі для пачатковай і сярэдняй школы, вынікі навуковых даследаванняў.

**Асноўная частка**. Чытацкі адрас выдання – адна з асноўных прыкмет, па якіх вылучаюцца віды і тыпы выданняў. Гэта група карыстальнікаў, якой выданне адрасуецца. Функцыянальнае прызначэнне адлюстроўвае сувязь і функцыянальную залежнасць групы выданняў ад патрэбаў пэўнай сферы грамадскага жыцця і практыкі. Змест выдання – паказальнік загалоўкаў выдання, які адлюстроўвае рубрыкацыі твораў і дапамагае ў пошуку частак выдання, а таксама інфармацыя, якая змяшчаецца ў канкрэтным выданні [4].

Мы ўстанавілі чатыры віды кніг арфаграфічнай тэматыкі 60-х гг. XX ст.: падручнікі для пачатковай школы, арфаграфічныя

слоўнікі для школьнікаў і масавага чытача, вучэбныя дапаможнікі для ВНУ, дысертацыі.

Да першага віду адносяцца падручнікі для пачатковых класаў. У залежнасці ад спецыфікі навучання яны падзяляюцца на тры групы: 1) падручнікі для школ з рускай мовай навучання; 2) падручнік для пачатковай школы без указання на мову навучання; 3) падручнікі для васьмігадовай школы без указання на мову навучання.

Падручнікі для школ з рускай мовай навучання штогод выдаваліся цягам усяго дзесяцігоддзя. Іх выпускам у свет займаліся два выдавецтвы: Дзяржаўнае вучэбна-педагагічнае выдавецтва Міністэрства асветы БССР, з 1964 г. – выдавецтва «Народная асвета». Так, падручнік для 3-га класа [5] вытрымаў дзевяць выданняў: першае ў 1961 г., дзявятае – у 1969 г. Падручнік для 4-га класа быў створаны ў 1962 г. [6]. Да 1969 г. ён перавыдаваўся восем разоў.

Да другой групы вучэбных кніг мы аднеслі 5-е выданне падручніка для 4-га класа пачатковай школы без указання на мову навучання [7]. Яно было выпушчана ў 1960 г. і стала адным з апошніх з гэтай серыі кніг.

З 1961 г. па 1969 г. актыўна ствараліся падручнікі трэцяй групы: для 1-га, 2-га, 3-га і 4-га класаў ужо васьмігадовай школы без указання на мову навучання. Напрыклад, аўтарамі кнігі для першакласнікаў сталі А. К. Севярнёва і С. С. Шыманская [8]. Аўтарамі кнігі для трэцякласнікаў – А. А. Макацёрчык і М. Ф. Машкарова [9]. Кніга вытрымала шэсць выданняў (1965 г., 1966 г., 1967 г., 1968 г., 1969 г.). Для чацвёртакласнікаў у вучэбным працэсе выкарыстоўвалі падручнікі А. К. Севярнёвай [10], а таксама аўтарскага калектыву ў складзе А. Р. Пушкарэвіч і М. І. Масальскай [11].

Другі від выданняў, які пачалі распрацоўваць беларускія навукоўцы ў 60-я гг., – лексікаграфічныя працы, што спрыялі засваенню арфаграфічных прадпісанняў і актыўна выкарыстоўваліся ў вучэбным працэсе. Сярод іх арфаграфічны слоўнік для сярэдняй школы з правіламі арфаграфіі і пунктуацыі ў пачатку выдання М. П. Лобана, М. Р. Судніка (1966) і арфаграфічны слоўнік для пачатковай школы на 4000 слоў (1968 г.), аўтары Т. А. Комар, К. А. Кобызева, С. М. Грабчыкаў, У. А. Сарока, Г. П. Хаткевіч, М. Я. Шчарбун. Усе яны былі выдадзены ў Мінску выдавецтвам «Народная асвета».

Трэці від – вучэбныя дапаможнікі для студэнтаў ВНУ. Іх выпускам займалася выдавецтва «Вышэйшая школа». Гэта ўпершыню ў пасляваенны час створаны спецыяльны дапаможнік для філалагічных спецыяльнасцей універсітэта і педінстытутаў БССР «Беларускі правапіс», падрыхтаваны Я М. Камароўскім у 1965 годзе [12], а таксама «Зборнік практыкаванняў па сучаснай беларускай мове» (1967 г.) – вучэбны дапаможнік для філалагічных факультэтаў ВНУ, складальнік І. М. Шчарбакова.

Доўгі час карыстаўся папулярнасцю сярод выкладчыкаў і студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей і «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: фанетыка, арфаграфія, лексікалогія» (1961 г.) – кніга для філалагічных факультэтаў і педінстытутаў БССР, створаная ў Інстытуце мовазнаўства імя Я. Коласа аўтарскім калектывам у складзе М. В. Бірылы, М. Г. Булахава і П. П. Шубы. Яна была выпушчана Дзяржаўным вучэбна-педагагічнам выдавецтвам Міністэрства асветы БССР і ўключала сем раздзелаў: «Фанетыка», «Арфаэпія», «Графіка», «Арфаграфія», «Лексікалогія», «Фразеалогія», «Лексікаграфія».

Адметнасць перыяду прадвызначалі навуковыя даследаванні арфаграфічнай сістэмы беларускай мовы ў дыяхраніі і сінхраніі. Дысертацыі і аўтарэфераты дысертацый, прысвечаныя беларускай арфаграфіі, складаюць чацвёртую групу выданняў. Акрамя кандыдацкай дысертацыі Я. М. Камароўскага, на аснове якой і быў створаны яго «Беларускі правапіс», у гэты час падрыхтаваў дысертацыю А. М. Булыка на тэму «Арфаграфічная сістэма старажытнага беларускага пісьменства» [13].

**Заключэнне**. Вучэбныя і навуковыя выданні 60-х гг. XX ст. адлюстравалі змены, што адбыліся не толькі ў адукацыйнай сферы, але і ў грамадскім, навуковым жыцці краіны. Чатыры групы выданняў, устаноўленыя намі (падручнікі для пачатковых класаў, арфаграфічныя слоўнікі для школьнікаў і масавага чытача, вучэбныя дапаможнікі для ВНУ, дысертацыі) засведчылі актывізацыю выдавецкай дзейнасці, імкненне навукоўцаў і рэдактараў зрабіць рэпертуар кніг па арфаграфіі living разнабаковым.

Спецыфіку выдавецкай практыкі адзначанага перыяду склалі штогадовыя перавыданні падручнікаў для пачатковых класаў, што ажыццяўлялі два выдавецтвы: Дзяржаўнае вучэбна-педагагічнае выдавецтва Міністэрства асветы БССР, з 1964 г. – выдавецтва «Народная асвета».

**Літаратура**


1. БССР у другой палове 1950-х-1980-я гг. / Инфопедия [Электронный ресурс].– Режим доступа: https://infopedia.su/10x81c8.html.– Дата доступа: 03.09.2019.

2. Правілы беларускай артаграфіі і пунктуацыі / Вікіпедыя [Электронны рэсурс].– Рэжым доступу: https://be-tarask.wikipedia.org/wiki/Правілы_беларускай_арфаграфіі_і_пунктуацыі _ (2008).– Дата доступу: 25.08.2019.

3. З гісторыі беларускага правапісу / Филологический факультет [Электронны рэсурс].– Рэжим доступу: http://philology.gsu.by/index.php/en/o-fakultete-2/10-o-fakultete/381-z-gistoryi-belaruskaga-pravapisu.html.– Дата доступу: 29.08.2019.

4. Антонова, С. Г. Редакторская подготовка изданий/ Центр дистанционного образования МГУП [Электронный ресурс].– Режим доступа: http://www.hi-edu.ru/e-books/xbook082/01/topicsw.htm.– Дата доступа: 29.08.2019.

5. Беларуская мова: чытанне, развіццё мовы, правапіс: падручнік для 3-га кл. шк. з рус. мовай навуч. / Р. П. Казімірава, Н. Л. Жалудзенка – Мн.: Дзярж. вучэб.-пед. выд-ва М-ва асветы БССР, 1961.– 237 с.

6. Беларуская мова: чытанне, правапіс, развіцце мовы: падруч. для 4-га кл. шк. з рус. мовай навуч. / М. Ф. Смаршчок, Н. Л. Жалудзенка, Р. П. Казімірава.– Мн.: Дзярж. вучэб.-пед. выд-ва М-ва асветы БССР, 1962.– 218, [1] с.

7. Беларуская мова: граматыка, правапіс і развіццё мовы: падручнік для 4-га класа пачатковай школы / А. К. Севярнёва і К. І. Шапялевіч.– Выд. 5-е.– Мн.: Дзяржаўнае вучэбна-педагагічнае выдавецтва Міністэрства асветы БССР, 1960.– 114, [1] с.

8. Беларуская мова: правапіс, развіццё мовы: падручнік для 1-га класа васьмігадовай школы / А. К. Севярнёва і С. С. Шыманская.– Выд. 4-е, выпраўленае.– Мн.: Народная асвета, 1964.– 110, [1]

9. Беларуская мова: граматыка, правапіс, развіццё мовы: падручнік для 3-га класа васьмігадовай школы / А. А. Макацёрчык, М. Ф. Машкарова.– Мн.: Дзяржаўнае вучэбна-педагагічнае выдавецтва, 1962.– 145, [2] с.

10. Севярнёва А. К. Беларуская мова: Граматыка, правапіс і развіццё мовы: падруч. для 4 кл. васьмігад. шк.– 8-е выд.– Мн.: Вучпедвыд БССР, 1963.– 107 с.

11. Беларуская мова: граматыка, правапіс, развіццё мовы: падручнік для 4-га класа васьмігадовай школы / А. Р. Пушкарэвіч і М. І. Масальская.– Выд. 3-е.– Мн.: Народная асвета, 1966.– 155, [1] с.

12. Беларускі правапіс: вучэбны дапаможнік для філалагічных спецыяльнасцей універсітэта і педінстытутаў БССР / Я. М. Камароўскі.– Мн.: Выш. шк., 1965.– 163 с.

13. Орфографическая система древней белорусской письменности: автореф. дисс. ... канд. филол. наук / А. Н. Булыко.– Минск, 1966.– 24 с.